


# НАВЭННА
## з нагоды малітоўнай падрыхтоўкі да прысвячэння Божай Міласэрнасці і Беззаганнаму Сэрцу Марыі Мінска-Магілёўскай мітраполіі ў 2025-м – Юбілейным годзе хрысціянства

# 90 гадоў Вяночку да Божай Міласэрнасці
# 120 гадоў з дня нараджэння
# св. с. Фаўстыны Кавальскай ZMBM

NIHIL OBSTAT
Цэнзар кс. кан. д-р Ян Крэміс
Мінск, 13 верасня 2024 г.
IMPRIMATUR
+ Арцыбіскуп Юзаф Станеўскі
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі
Старшыня Канферэнцыі Біскупаў
Мінск, № 189/к/24 ад 14 верасня 2024 г.

***Міласэрнасць Божая, якая сыходзіць з Сэрца Езуса, давяраем Табе…***

У Нацыянальным санктуарыі Маці Божай Будслаўскай працягваюцца традыцыйныя пілігрымкі вернікаў у першыя суботы месяца. У сувязі з падрыхтоўкай да Юбілейнага года хрысціянства прапануюцца тэксты набажэнстваў, прысвечаных Божай Міласэрнасці і перапрашэнню Беззаганнага Сэрца Марыі. (5 ліпеня 2025 г. падчас урачыстасці Маці Божай Будслаўскай можна даверыць Беларусь Божай Міласэрнасці — паводле Акту прысвячэння свету Божай Міласэрнасці, здзейсненага св. Янам Паўлам II 17.08.2002 г. у Кракаве, і Беззаганнаму Сэрцу Марыі — таксама паводле св. Яна Паўла II)**.**

1. **Навэнна да Божай Міласэрнасці** (з разважаннямі з «Дзённіка» св. с. Фаўстыны на кожны месяц з **05.10.2024** г. да **07.06.2025 г.**).
2. **Фацімскі Ружанец** (з разважаннямі з “Дзённіка” св. с.Фаўстыны)
3. **Набажэнства да Божай Міласэрнасці:**
   - Разважанні (на выбар) з Дзённічка св. с. Фаўстыны (па чарговых днях Навэнны)
   - Вяночак да Божай Міласэрнасці
   - Літанія да Божай Міласэрнасці

# ПЛАН НАВЕДВАННЯ САНКТУАРЫЯ
## 5 кастрычніка 2024 г. – 7 чэрвеня 2025 г.

| **Дзень навэн-ны** | **Дата** | **Дэканат** | **Адказны** | **Інтэнцыя** |
|---|---|---|---|---|
| I | 5 кастрычніка | Мядзельскі | кс. кан. Багуслаў Маджэеўскі | Молімся аб міласэрнасці для ўсяго чалавецтва |
| II | 2 лістапада | Парафія ў Будславе | Кс. пробашч Дзмітрый Дубовік | Молімся за душы ў чыстцы |
| III | 7 снежня | Барысаўскі | кс. кан. Аляксей Раманчук | Молімся за духавенства, праз якое на чалавецтва сыходзіць Божая Міласэрнасць |
| IV | 4 студзеня | Вілейскі Маладзе-чанскі | кс. кан. А. Барыла<br>кс. прэлат кан. Э. Даўгіловіч | Молімся за ўсіх хрысціянаў |
| V | 1 лютага | Нясвіжскі | кс. кан. Пётр Шарко | Молімся за язычнікаў і няверуючых, якія яшчэ не ведаюць пра Божую Міласэрнасць |
| VI | 1 сакавіка | Магілёўскі Бабруйскі | кс. А. Кеўліч<br>кс. кан. А. Яркавец | Молімся за душы абыякавыя, якія былі прычынаю цярпенняў Хрыста Пана ў садзе Аліўным |
| VII | 5 красавіка | Стаўбцоўскі Валожынскі | кс. кан. Ігар Лашук | Молімся за тых, хто застаецца па-за Касцёлам, каб вярнуліся ў яго супольнасць |
| VIII | 3 мая | Мінск – Захад | кс. кан. Францішак Рудзь | Молімся за тых, хто асаблівым чынам ушаноўвае і праслаўляе Божую Міласэрнасць |
| IX | 7 чэрвеня | Мінск – Усход | кс. Аляксандр Мятліцкі SDB | Молімся за душы ціхія і пакорныя і за дзяцей |

Мінск, 29 верасня 2024 г.

**Першы дзень (першы месяц навэнны)** _5 кастрычніка 2024 г._

*Молімся аб міласэрнасці для ўсяго чалавецтва:*

Езу найміласэрнейшы, толькі Ты літуешся над намі і прабачаеш нам. Не зважай на грахі нашыя, але на давер, які ўскладаем на бясконцую дабрыню Тваю, і прымі ўсіх нас да дому Найлітасцівейшага Сэрца свайго і не адпускай нас з Яго навекі. Просім Цябе праз любоў Тваю, якая яднае Цябе з Айцом і Духам Святым.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на бедных грэшнікаў і на ўсё чалавецтва, якое ўкрыта ў Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса, і дзеля Яго балеснай мукі акажы нам сваю міласэрнасць, каб мы праслаўлялі ўсемагутнасць Тваёй міласэрнасці на векі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 72:** Езу, Праўда Спрадвечная, Жыццё нашае, малю і пакорна прашу міласэрнасці Тваёй да бедных грэшнікаў. Наймілейшае Сэрца Пана майго, поўнае літасці і неспасцігальнай міласэрнасці, малю Цябе за бедных грэшнікаў. О Сэрца Найсвяцейшае, крыніца міласэрнасці, з якой льюцца промні неспасцігальных ласкаў на ўвесь род чалавечы, малю Цябе аб святле для бедных грэшнікаў. О Езу, памятай пра горкую муку сваю і не дазволь, каб гінулі душы, адкупленыя такою дарагою Тваёю Найсвяцейшаю Крывёю. О Езу, калі я разважаю пра гэту вялікую цану Тваёй Крыві, то радуюся яе велічы, бо аднае яе кроплі хапіла б для адкуплення ўсіх грэшнікаў. Хоць грэх — гэта прорва зла і няўдзячнасці, аднак цана, пакладзеная за нас, ні з чым непараўнальная. Таму няхай кожная душа верыць і мае надзею ў міласэрнасці Пана. Бог нікому не адмовіць у сваёй міласэрнасці. Неба і зямля могуць перамяніцца, але не вычарпаецца міласэрнасць Божая. О, якою радасцю гарыць маё сэрца, калі я бачу гэту неспасцігальную дабрыню Тваю, о Езу мой.

Я прагну прывесці ўсіх грэшнікаў да Твайго падножжа, каб праслаўленая была ва ўсе вякі Твая міласэрнасць.

**Дз 300:** Чалавецтва не знойдзе супакаення, пакуль не звернецца з даверам да Маёй міласэрнасці...

**Дз 951:** О неспасцігальная і бязмежная міласэрнасць Божая, Хто Цябе годна ўшанаваць і праславіць можа!? Найвялікшая ўласцівасць Усемагутнага Бога, Ты — надзея адзіная для грэшнага і слабога.

Зоркі, зямля і мора, з’яднайцеся ў адзіным гімне і разам удзячна апявайце неспасцігальную Божую міласэрнасць.

**Другі дзень (другі месяц навэнны)** _2 лістапада 2024 г._

*Молімся за душы ў чыстцы:*

Езу найміласэрнейшы, які сказаў: *«Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны»* (Лк 6, 36), прымі ў дом Твайго Найлітасцівейшага Сэрца душы, якія пакутуюць у чыстцы.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы, якія пакутуюць у чыстцы, і праз балесную муку Езуса Хрыста і праз горыч, якою было заліта Яго Найсвяцейшае Сэрца, акажы ім міласэрнасць сваю. Просім Цябе, каб глядзеў на іх не інакш, як толькі праз раны Наймілейшага Сына свайго, бо верым, што дабрыня Твая і літасць бязмежныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 20:** Я спытала ў Пана Езуса, за каго яшчэ мне трэба маліцца? Езус адказаў, што ў наступную ноч дасць мне знак, за каго я павінна маліцца. Я ўбачыла Анёла Ахоўніка, які загадаў мне ісці за сабою. У адзін момант я апынулася ў імглістым месцы, напоўненым агнём, а ў ім было цэлае мноства церпячых душаў. Гэтыя душы вельмі горача моляцца, але безвынікова для сябе — толькі мы можам прыйсці ім на дапамогу. Полымя, якое апякала іх, не дакраналася да мяне. Мой Анёл Ахоўнік не пакідаў мяне ні на хвіліну. І я запытала ў гэтых душаў, ад чаго яны найбольш церпяць. І яны ў адзін голас адказалі мне, што найбольшае іх цярпенне — гэта туга па Богу. Я бачыла Маці Божую, якая наведвае душы ў чыстцы. Душы называюць Марыю «Зоркаю Мора». Яна ім прыносіць прахалоду. Я хацела паразмаўляць з імі больш, але мой Анёл Ахоўнік даў мне знак, што пара выходзіць. Мы выйшлі за дзверы гэтай пакутнай вязніцы. [Я пачула ўнутраны голас], які сказаў: Міласэрнасць Мая не хоча гэтага, але справядлівасць патрабуе. З гэтага часу я больш цесна кантактую з церпячымі душамі.

**Дз 153:** Аднойчы я ўбачыла дзве дарогі: адна была шырокая, высыпаная пяском і кветкамі, поўная радасці, музыкі і розных задавальненняў. Людзі ішлі гэтаю дарогаю, танцуючы і радуючыся. Яны даходзілі да канца, не заўважаючы, што ўжо канец. Але напрыканцы гэтай дарогі была страшная прорва ці пякельная бездань. Душы гэтыя ўсляпую падалі ў гэтую прорву — як ішлі, так і падалі. І была іх такая вялікая колькасць, што нельга было іх злічыць. І бачыла я іншую дарогу, а хутчэй — сцежку, бо яна была вузкая і ўсланая цернямі і камянямі, а людзі ішлі па ёй са слязьмі ў вачах, і розныя пакуты былі іх лёсам. Некаторыя падалі на гэтыя камяні, але тут жа ўставалі і ішлі далей. А ў канцы дарогі быў цудоўны сад, перапоўнены разнастайным шчасцем, і ўсе гэтыя душы ўваходзілі туды. І адразу ж, у першае імгненне, яны забывалі пра свае цярпенні.

**Дз 811:** Увайшоўшы ў свой ізалятар, я пачула такія словы: У гадзіну смерці Я абараняю кожную душу, як сваю хвалу, калі яна моліцца гэты Вяночак, альбо калі пры паміраючым яго памоляцца іншыя — яны атрымаюць такі самы адпуст. Калі пры паміраючым моляцца гэты Вяночак, уціхамірваецца гнеў Божы, неспасцігальная міласэрнасць атуляе душу і ўзварушваюцца глыбіні Маёй міласэрнасці дзеля балеснай мукі Майго Сына. О калі б усе зразумелі, якая вялікая міласэрнасць Пана, але як жа ўсім нам патрэбная гэтая міласэрнасць, асабліва ў гэтую вырашальную гадзіну.

**Трэці дзень (трэці месяц навэнны)** _7 снежня 2024 г._

*Молімся за духавенства, праз якое на чалавецтва сыходзіць Божая Міласэрнасць:*

Езу найміласэрнейшы, ад Цябе сыходзіць усё добрае, памнож у нас ласку, каб мы годна выконвалі ўчынкі міласэрнасці, каб тыя, што на нас глядзяць, праслаўлялі Айца міласэрнасці, які ёсць у небе.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на супольнасць абраных у вінаградніку сваім, на душы святарскія і манаскія, і адары іх моцаю свайго благаслаўлення, а дзеля пачуццяў Сэрца Сына свайго, у якім душы гэтыя прабываюць, удзялі ім моцы і святла свайго, каб маглі яны весці іншых па дарогах збаўлення, каб разам спявалі хвалу неспасцігальнай міласэрнасці Тваёй на векі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 531:** Езус сказаў сястры Фаўстыне: «Ты будзеш яднаць зямлю з небам, будзеш лагодзіць справядлівы Божы гнеў і будзеш выпрошваць міласэрнасць для свету. Я аддаю табе ў апеку дзве каштоўныя для Майго сэрца пярліны — гэта душы святароў і манаскія душы; за іх ты будзеш асабліва маліцца, іх сіла будзе ў вашым знясільванні. Малітвы, пасты, утаймаванні, працу і ўсе цярпенні ты будзеш яднаць з Маімі малітваю, постам, утаймаваннем, працаю, цярпеннем, і тады яны будуць мець сілу перад Маім Айцом».

**Дз 1602:** Сёння Пан сказаў мне: Дачка, калі прыступаеш да святой споведзі, да гэтай крыніцы Маёй міласэрнасці, на тваю душу заўсёды сплываюць Мая кроў і вада, якія выплылі з Майго сэрца і ўзвышаюць тваю душу. Кожны раз, набліжаючыся да канфесіянала, з вялікім даверам цалкам пагружайся ў Маю міласэрнасць, каб Я мог выліць на тваю душу шчодрасць сваёй ласкі.

Калі ты прыходзіш на споведзь, ведай, што Я сам чакаю цябе ў канфесіянале; Я толькі засланяюся святаром, але сам дзейнічаю ў душы. Тут мізэрнасць душы сустракаецца з Богам міласэрнасці.

Скажы душам, што з гэтай крыніцы міласэрнасці душы чэрпаюць ласкі толькі начыннем даверу. Калі іх давер будзе вялікі, Маёй шчодрасці не будзе межаў. Струмені Маёй ласкі заліваюць пакорныя душы. Ганарлівыя — заўсёды ў бядзе і ўбостве, бо Мая ласка адварочваецца ад іх да пакорных душаў.

**Дз 367:** Я звяртаюся да вас — вы, выбраныя душы, няўжо і вы не зразумееце любові Майго сэрца? І тут падманулася Маё Сэрца, Я не знаходжу поўнай адданасці Маёй любові: гэтулькі адгаворак, гэтулькі недаверу, гэтулькі перасцярогаў. На радасць табе Я скажу, што ёсць душы, якія жывуць у свеце, якія Мяне шчыра любяць, у іх сэрцах Я прабываю з асалодаю, але такіх няшмат.

І ў кляштарах ёсць такія душы, якія напаўняюць радасцю Маё Сэрца, у іх увасоблены Мае рысы, і таму Нябесны Айцец пазірае на іх з асаблівым адабрэннем. Яны будуць цудам для анёлаў і людзей; іх колькасць вельмі малая, яны — абарона перад правасуддзем нябеснага Айца і выпрошванне міласэрнасці для свету. Любоў і ахвяра гэтых душаў падтрымліваюць існаванне свету. Найбольш балюча раніць Маё Сэрца нявернасць душы, Мною выбранай асаблівым чынам. Такая нявернасць — гэта дзіда, якая прабівае Маё Сэрца.

**Дз 1052:** О мой Езу, я прашу Цябе за ўвесь Касцёл, дай яму любоў і святло свайго Духу, дай сілу святарскім словам, каб зацвярдзелыя сэрцы пакаяліся і вярнуліся да Цябе, Пане. Пане, дай нам святых святароў. Ты сам захавай іх у святасці. О Боскі і Найвышэйшы Святар, няхай моц Тваёй міласэрнасці спадарожнічае ім усюды і бароніць іх ад д’ябальскіх п*а*стак і н*е*ратаў, якія пастаянна расстаўляюцца на святарскія душы. О Пане, няхай моц Тваёй міласэрнасці крушыць і ператварае ў пыл усё, што магло б азмрочыць святасць святара, бо Ты ўсё можаш.

**Чацвёрты дзень (чацвёрты месяц навэнны)** <u>*4 студзеня 2025 г.*</u>

*Молімся за ўсіх хрысціянаў:*

Езу найміласэрнейшы, Ты ўсім надзвычай шчодра ўдзяляеш свае ласкі са скарбніцы міласэрнасці сваёй. Прымі нас да Найлітасцівейшага Сэрца свайго і не адпускай нас навекі. Просім Цябе аб гэтым праз неспасцігальную любоў Тваю, якою палае Тваё Сэрца да Айца Нябеснага.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы верныя як на спадчыну Сына свайго і дзеля Яго балеснай мукі ўдзялі ім сваё благаслаўленне і атуляй іх сваёю пастаяннаю апекаю, каб не страцілі любові і скарбу святой веры, але каб з усімі анёламі і святымі праслаўлялі бязмежную міласэрнасць Тваю праз вякі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 1448:** Пішы, гавары пра Маю міласэрнасць. Скажы душам, дзе яны павінны шукаць суцяшэння, — у судзе міласэрнасці; там — найвялікшыя цуды, якія пастаянна паўтараюцца. Каб заслужыць гэты цуд, не трэба здзяйсняць ні далёкай пілігрымкі, ні якіхсьці знешніх абрадаў — дастаткова з вераю прыступіць да падножжа Майго намесніка і сказаць яму пра сваю бяду, і цуд Божай міласэрнасці з’явіцца ва ўсёй паўнаце. Нават калі душа, як труп, загнівае і ў людскім разуменні ўваскрашэнне ўжо немагчымае, і ўсё ўжо страчана — для Бога гэта не так; цуд Божай міласэрнасці ўваскрашае такую душу ва ўсёй паўнаце. Бедныя тыя, хто не карыстаецца гэтым цудам Божай міласэрнасці; дарэмна будзеце клікаць — будзе ўжо запозна.

**Дз 377:** Са святой споведзі мы павінны атрымліваць дзве карысці: першая — на споведзь мы прыходзім па аздараўленне; другая — (прыходзім) па выхаванне — нашай душы патрэбна пастаяннае выхаванне, як малому дзіцяці.

О мой Езу, я глыбока разумею гэтыя словы і ведаю з досведу, што, разлічваючы на ўласныя сілы, душа далёка не зойдзе, шмат намучыцца, нічога для хвалы Божай не зробіць, будзе пастаянна блукаць, бо наш розум цёмны і не ўмее разабрацца ва ўласных справах. Я буду звяртаць асаблівую ўвагу на дзве рэчы: першае — для споведзі я буду выбіраць тое, што мяне больш за ўсё прыніжае, нават калі гэта будзе дробязь, але дарага мне будзе каштаваць, і таму я буду пра гэта казаць; другое — я буду практыкавацца ў пакаянні не толькі ў часе споведзі, але пры кожным рахунку сумлення я буду абуджаць у сабе дасканалы жаль, і асабліва, калі лягу адпачываць. Яшчэ адно слова: душа, якая шчыра жадае ўдасканальвацца, павінна дакладна прытрымлівацца парадаў, якія дае духоўны кіраўнік. Колькі залежнасці — столькі й святасці.

**Пяты дзень (пяты месяц навэнны)** 1 лютага 2025 г.

*Молімся за язычнікаў і няверуючых, якія яшчэ не ведаюць пра Божую Міласэрнасць:*

Езу найміласэрнейшы, Ты — святло ўсяму свету, прымі да дому Найлітасці-вейшага Сэрца свайго душы язычнікаў, якія Цябе яшчэ не ведаюць; няхай промні ласкі Тваёй асветляць іх, каб і яны разам з намі праслаўлялі незвычайную міласэрнасць Тваю, і не адпускай іх з дому Найлітасцівейшага Сэрца свайго.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы язычнікаў і тых, хто Цябе яшчэ не ведае і хто прабывае ў Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса. Прыцягні іх да святла Евангелля. Учыні, каб і яны праслаўлялі шчодрасць міласэрнасці Тваёй на векі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 1396:** Сёння я пачула ў душы голас: О, калі б грэшнікі ведалі пра Маю міласэрнасць, яны б не гінулі ў такой вялікай колькасці. Кажы грэшным душам, каб яны не баяліся наблізіцца да Мяне, кажы пра Маю вялікую міласэрнасць.

**Дз 598:** О, як горача я прагну, каб Тваю міласэрнасць праслаўляла кожная душа. Шчаслівая тая душа, якая звяртаецца да міласэрнасці Пана; яна спазнае тое, аб чым сказаў Пан, што Ён будзе абараняць яе, як сваю хвалу, а хто асмеліцца змагацца з Богам? Кожная душа, праслаўляй міласэрнасць Пана сваёю вераю ў Яго міласэрнасць, усім сваім жыццём, і асабліва ў гадзіну смерці, і нічога не бойся, дарагая душа, якою б ты ні была, бо чым большы грэшнік, тым большае ён мае права на Тваю міласэрнасць, Пане. О неспасцігальная дабрыня, Бог першы паніжаецца да грэшніка. О Езу, я прагну праслаўляць Тваю міласэрнасць за тысячы душаў. О мой Езу, я добра ведаю, што павінна гаварыць душам пра Тваю дабрыню, пра Тваю неспасцігальную міласэрнасць.

**Дз 1541:** Дачка Мая, заахвочвай душы маліцца Вяночак, які Я табе даў. Тым, хто моліцца гэты Вяночак, Мне прыемна даць усё, аб чым яны Мяне папросяць. Калі яго будуць маліцца закаранелыя грэшнікі, Я напоўню іх душы спакоем, а гадзіна іх смерці будзе шчаслівая. Напішы гэта для засмучаных душаў: калі душа ўбачыць і зразумее цяжар сваіх грахоў, калі адкрыецца перад вачыма яе душы ўся бездань мізэрнасці, у якой яна патанула, няхай яна не адчайваецца, але з даверам кідаецца ў абдымкі Маёй міласэрнасці, як дзіця ў абдымкі любай матулі. Гэтыя душы ў першую чаргу могуць разлічваць на Маё літасцівае сэрца, яны ў першую чаргу маюць права на Маю міласэрнасць. Скажы, што ніводная душа, якая заклікала Маю міласэрнасць, не падманулася і не спазнала сораму. Мне асабліва падабаецца душа, якая даверылася Маёй дабрыні. Напішы, што, калі гэты вяночак будуць маліцца каля паміраючых, Я стану паміж Айцом і паміраючаю душою не як справядлівы Суддзя, а як міласэрны Збаўца.

**Шосты дзень (шосты месяц навэнны)** 1 сакавіка 2025 г.

*Молімся за душы абыякавыя, якія былі прычынаю цярпенняў Хрыста Пана ў садзе Аліўным.*

Езу найміласэрнейшы, Ты — сама літасць, увядзі ў святыню Найлітасцівейшага Сэрца свайго ўсе абыякавыя душы. Няхай у гэтым полымі Тваёй чыстай любові адаграюцца гэтыя зледзянелыя, да мерцвякоў падобныя душы, якія да гэтага часу выклікалі ў Цябе агіду. О Езу найлітасцівейшы, магутнасцю міласэрнасці сваёй прыцягні іх да агню сваёй любові і адары іх святой любоўю, бо Ты ўсё можаш.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы абыякавыя, якія прабываюць у Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса. Ойча міласэрнасці, прашу Цябе: праз балесную муку Сына Твайго і праз трохгадзіннае кананне Яго на крыжы дазволь, каб і яны праслаўлялі бяздоннасць міласэрнасці Тваёй на векі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 1228:** Сёння прывядзі да Мяне абыякавыя душы і акуні іх у бездані Маёй міласэрнасці. Гэтыя душы найбольш балюча раняць Маё сэрца. Найбольшую непрыязнасць у Гетсэманскім садзе Мая душа зведала ад абыякавай душы. Яны былі прычынаю таго, што Я прамовіў: Ойча, калі Ты жадаеш, адхілі ад Мяне гэты келіх. Для іх апошняя надзея на ратунак — звярнуцца да Маёй міласэрнасці.

**Дз 378:** Што Бог бясконца міласэрны, — ніхто не можа запярэчыць; Ён жадае, каб пра гэта ведалі ўсе. Перш чым Ён прыйдзе паўторна як Суддзя, Ён хоча, каб душы спачатку пазналі Яго як Валадара міласэрнасці. Калі гэты трыумф настане, мы ўжо будзем у новым жыцці, у якім няма цярпенняў, але спачатку твая душа будзе напоўнена горыччу ад сузірання безвыніковасці тваіх намаганняў.

Аднак гэта толькі так здаецца, бо калі Бог штосьці вырашыў, Ён таго не змяняе; але хоць пар*а*за будзе ўяўнай, цярпенне будзе сапраўдным. Калі гэта настане, я не ведаю; як доўга будзе працягвацца, не ведаю.

Але Бог паабяцаў вялікую ласку — асабліва табе і ўсім, хто будзе абвяшчаць Маю вялікую міласэрнасць. Я сам буду ахоўваць іх у гадзіну смерці як сваю хвалу. І нават калі б грахі душаў былі чорныя, як ноч, калі грэшнік звяртаецца да Маёй міласэрнасці, ён аддае Мне найвялікшую хвалу і з’яўляецца гонарам Маёй мукі. Калі душа праслаўляе Маю дабрыню, сатана дрыжыць перад ёю і ўцякае на самае дно пекла.

**Дз 741:** Сёння, уведзеная анёлам, я пабыла ў бездані пекла. Гэта месца вялікай пакуты, які ж страшэнна вялікі яго абшар. Вось разнавіднасці мукаў, якія я ўбачыла: першая мука, што з’яўляецца пеклам, — гэта страта Бога; другая — пастаянныя дакоры сумлення; трэцяя — немагчымасць змяніць свой лёс; чацвёртая мука — гэта агонь, які будзе працінаць душу, але не знішчыць яе, — гэта страшная мука, чыста духовы агонь, запалены Божым гневам; пятая мука — пастаянная цемра, страшны ўдушлівы пах, і хоць пануе цемра, д’яблы і асуджаныя душы бачаць адны адных і бачаць усё сваё і чужое зло; шостая мука — гэта пастаянная прысутнасць сатаны; сёмая мука — гэта страшная роспач, нянавісць да Бога, лаянка, пракляцці, блюзнерствы. Гэта мучэнні, якія ўсе асуджаныя церпяць разам, але гэта не ўсе мукі. Ёсць асобныя мукі для душаў, пачуццёвыя мукі: чым кожная душа грашыла, тым яна і мучыцца невыказна страшным чынам. Ёсць жахлівыя лёхі, бездані мукі, дзе адна мука адрозніваецца ад другой; я памерла б ад відовішча гэтых страшных мучэнняў, калі б мяне не падтрымлівала Божая ўсемагутнасць. Няхай грэшнік ведае: якою пачуццёвасцю грашыць, такою будзе мучыцца ўсю вечнасць. Я пішу пра гэта па Божым загадзе, каб аніводная душа не апраўдвалася тым, што няма пекла, альбо тым, што ніхто там не быў і не ведае, як яно там.

Я, сястра Фаўстына, па загадзе Божым была ў бездані пекла дзеля таго, каб казаць душам і сведчыць, што пекла ёсць. Пра гэта я цяпер не магу гаварыць, Бог загадаў мне, каб я гэта напісала.

Д’яблы палалі да мяне вялікай нянавісцю, але па Божым загадзе яны мусілі быць мне паслухмянымі. Тое, што я напісала, — толькі слабы цень таго, што я бачыла. Адно я заўважыла — што там больш за ўсё душаў, якія не верылі, што пекла існуе. Апамятаўшыся, я не магла ачомацца ад жаху перад тым, як страшна там церпяць душы, і таму я яшчэ больш горача малюся аб навяртанні грэшнікаў, пастаянна малю аб Божай міласэрнасці для іх. О мой Езу, я лічу за лепшае да канца свету паміраць у найвялікшых муках, чым хоць бы найменшым грахом абразіць Цябе.

**Сёмы дзень (сёмы месяц навэнны)** 5 красавіка 2025 г.

*Молімся за тых, хто застаецца па-за Касцёлам, каб вярнуліся ў яго супольнасць:*

Езу найміласэрнейшы, Ты – сама дабрыня і не адмаўляеш у святле тым, хто просіць Цябе. Прымі да Найлітасцівейшага Сэрца свайго душы братоў нашых адлучаных, прыцягні іх сваім святлом да еднасці з Касцёлам і не адпускай іх з дому Найлітасцівейшага Сэрца свайго. Учыні, каб і яны праслаўлялі шчодрасць міласэрнасці Тваёй.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы братоў нашых адлучаных, асабліва тых, хто растраціў даброты Твае і злоўжываў ласкамі Тваімі, і хто ўпарта прабывае ў сваіх грахах. Не глядзі на іх памылкі, але глядзі на любоў Сына свайго і на балесную муку Ягоную, якую Ён прыняў дзеля іх, таму што і яны прабываюць у Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса. Учыні, каб і яны праслаўлялі вялікую міласэрнасць Тваю на векі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 367:** Аднаго разу Езус даў мне зразумець, што, калі я прашу Яго ў інтэнцыі, якую мне часам даручаюць, Ён заўсёды гатовы ўдзяліць свае ласкі, але душы не заўсёды хочуць іх прыняць: Маё сэрца перапоўнена вялікаю міласэрнасцю да душаў, і асабліва да бедных грэшнікаў. Толькі б яны маглі зразумець, што Я для іх — найлепшы Айцец, што дзеля іх з Майго сэрца выплылі кроў і вада, як з крыніцы, перапоўненай міласэрнасцю; дзеля іх Я прабываю ў табэрнакулюме як Валадар міласэрнасці, Я прагну адорваць душы ласкамі, але [яны] не хочуць іх прыняць. Прынамсі ты прыходзь да Мяне як мага часцей і бяры гэтыя ласкі, якіх яны прыняць не хочуць, і гэтым ты суцешыш Маё сэрца. О, якая вялікая абыякавасць душаў у адказ на гэтулькі дабрыні, на гэтулькі доказаў любові.

Маё Сэрца перапаўняецца адною няўдзячнасцю і забыццём ад душаў, якія жывуць у свеце; на ўсё ў іх ёсць час, толькі не маюць часу на тое, каб прыйсці да Мяне па ласкі.

**Дз 1784:** Сёння ў працяглай размове Пан сказаў мне: Як моцна Я прагну збаўлення душаў. Мая наймілейшая сакратарка, напішы, што Я прагну пераліваць сваё Боскае жыццё ў людскія душы і асвячаць іх, каб яны толькі захацелі прыняць Маю ласку. Найбольшыя грэшнікі дасягнулі б вялікай святасці, калі б толькі даверыліся Маёй міласэрнасці. Мая душа перапоўненая міласэрнасцю, якая ахоплівае ўсё, што Я стварыў. Для Мяне асалода — дзейнічаць у чалавечай душы, напаўняць яе сваёю міласэрнасцю і апраўдваць яе. Маё валадарства на зямлі — гэта Маё жыццё ў чалавечай душы. Напішы, Мая сакратарка, што Я сам непасрэдна з’яўляюся кіраўніком душаў, а апасродкавана кірую імі праз святара і кожную вяду да святасці толькі Мне вядомым шляхам.

**Восьмы дзень (восьмы месяц навэнны)** <u>*3 мая 2025 г.*</u>

*Молімся за тых, хто асаблівым чынам ушаноўвае і праслаўляе Божую Міласэрнасць:*

Езу найміласэрнейшы, Сэрца Тваё – сама любоў, прымі ў дом Найлітасцівейшага Сэрца свайго душы тых, хто асабліва ўшаноўвае і праслаўляе веліч міласэрнасці Тваёй. Душы гэтыя магутныя сілаю самога Бога; сярод пакутаў і цяжкасцяў яны ідуць наперад, спадзеючыся на міласэрнасць Тваю. Паяднаныя з Табою, о Езу, душы гэтыя нясуць усё чалавецтва на плячах сваіх. Яны не будуць асуджаныя сурова, а міласэрнасць Твая атуліць іх у хвіліну смерці.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы, якія праслаўляюць і ўшаноўваюць невымоўную годнасць Тваю, Тваю неспасцігальную міласэрнасць, якія прабываюць у Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса. Душы гэтыя з’яўляюцца жывым Евангеллем, рукі іх поўняцца ўчынкамі міласэрнасці, а сэрцы, перапоўненыя радасцю, будуць спяваць песню міласэрнасці Найвышэйшаму. Прашу Цябе, Божа, акажы ім міласэрнасць сваю паводле надзеі і даверу, якія на Цябе ўскладалі. Няхай споўніцца на іх абяцанне Езуса, які сказаў ім, што душы, якія будуць ушаноўваць гэтую неспасцігальную міласэрнасць Ягоную, сам Ён будзе бараніць у жыцці, а асабліва ў хвіліну смерці, як сваю хвалу. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**Дз 379:** У часе адной адарацыі Езус паабяцаў мне: З душамі, якія будуць прыбягаць да Маёй міласэрнасці і якія будуць яе праслаўляць, і абвяшчаць іншым пра Маю вялікую міласэрнасць, Я паступлю ў гадзіну смерці адпаведна Маёй бясконцай міласэрнасці. Баліць Маё Сэрца, — казаў Езус, — з-за таго, што нават выбраныя душы не разумеюць, якая вялікая Мая міласэрнасць; іх зносіны [са Мною] ёсць у пэўным сэнсе недаверам. О, як моцна гэта раніць Маё Сэрца!

Успомніце пра Маю муку і, калі не верыце Маім словам, паверце прынамсі Маім ранам.

**Дз 848:** Молячыся Вяночак, я раптам пачула голас: О, якія вялікія ласкі Я ўдзялю душам, якія будуць маліцца гэты Вяночак; глыбіні Маёй міласэрнасці ўзрушаныя для тых, хто моліцца Вяночак. Запішы гэтыя словы, дачка Мая, кажы свету пра Маю міласэрнасць, няхай усё чалавецтва спазнае Маю неспасцігальную міласэрнасць. Гэта знак на апошнія часы, пасля іх настане судны дзень. Пакуль ёсць час, няхай людзі прыбягаюць да крыніцы Маёй міласэрнасці, няхай шукаюць падмацунку ў крыві і ў вадзе, якія дзеля іх выплылі. О людскія душы, дзе вы схаваецеся ў дзень гневу Божага? Прыбягайце цяпер да крыніцы Божай міласэрнасці. О, якую вялікую колькасць душаў я бачу, бачу, што яны праславілі Божую міласэрнасць і будуць вечна спяваць песню хвалы.

**Дз 1578:** Душы, якія імкнуцца да дасканаласці, няхай асабліва ўшаноўваюць Маю міласэрнасць, бо шчодрасць ласкаў, якія Я ім удзяляю, струменіць з Маёй міласэрнасці. Я жадаю, каб гэтыя душы вызначаліся бязмежным даверам да Маёй міласэрнасці. Я сам займаюся асвячэннем такіх душаў, Я дам ім усё, што будзе неабходна для іх святасці. Ласкі з Маёй міласэрнасці чэрпаюцца адным начыннем — даверам. Чым больш душа давярае, тым больш атрымлівае. Душы, якія бязмежна давяраюць, для Мяне — вялікая радасць, бо такім душам Я даю ўсе скарбы сваіх ласкаў. Я радуюся, што яны шмат патрабуюць, бо Маё жаданне — шмат даваць, прычым вельмі шмат.

**Дзявяты дзень (дзявяты месяц навэнны)** <u>*7 чэрвеня 2025 г.*</u>

*Молімся за душы ціхія і пакорныя і за дзяцей:*

Езу найміласэрнейшы, Ты сам сказаў: *«Навучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам»* (Мц 11, 29), прымі да дому Найлітасцівейшага Сэрца свайго ціхія і пакорныя душы і душы малых дзяцей. Няхай гэтыя душы прыводзяць у захапленне ўсё неба і будуць асаблівым упадабаннем Айца Нябеснага, а таксама духмяным букетам перад тронам Божым, ад водару якога сам Бог мае асалоду. Няхай гэтыя душы пастаянна будуць у Найлітасцівейшым Сэрцы Тваім і нястомна спяваюць гімн любові і міласэрнасці навекі.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы ціхія, пакорныя і на душы малых дзяцей, якія прабываюць у доме Найлітасцівейшага Сэрца Езуса. Гэтыя душы найбольш падобныя да Сына Твайго, водар гэтых душаў узносіцца з зямлі і дасягае трона Твайго. Ойча міласэрнасці і ўсялякае дабрыні, прашу Цябе праз любоў і ўпадабанне, якія маеш у гэтых душах, благаславі ўвесь свет, каб усе душы разам спявалі пашану міласэрнасці Тваёй праз вякі вечныя. Амэн.

*Разважанне з Дзённіка (на выбар) перад Вяночкам да Божай Міласэрнасці:*

**1743** Бясконцая Божая дабрыня ў стварэнні людзей. Божа, які з міласэрнасці сваёй пажадаў паклікаць да жыцця род людскі, Ты шчодра адарыў яго натураю і ласкаю. Але Тваёй дабрыні для гэтага як быццам недастаткова: Ты, Пане, у сваёй міласэрнасці даеш нам вечнае жыццё. Ты дапускаеш нас да свайго вечнага шчасця і дазваляеш нам удзельнічаць у сваім духовым жыцці, і чыніш гэта толькі з міласэрнасці сваёй. Ты адорваеш нас сваёю ласкаю толькі таму, што Ты добры і поўны любові. Мы зусім не былі Табе патрэбныя для Твайго шчасця, але Ты, Пане, хочаш падзяліцца сваім шчасцем з намі.

Але чалавек не вытрываў выпрабавання; Ты мог бы яго пакараць, як тых анёлаў, вечнаю адпрэчанасцю, але тут праявілася Твая міласэрнасць, і Твая душа ўзрушылася вялікай літасцю, і Ты прысягнуў сам учыніць нашае збаўленне. Неспасцігальная бездань Тваёй міласэрнасці ў тым, што Ты не пакараў нас так, як мы таго заслужылі. О Пане, няхай будзе праслаўлена Твая міласэрнасць; мы будзем вечна праслаўляць яе…

**Дз 1572:** Дачка Мая, Я нагадваю табе: кожны раз, калі ты пачуеш, што гадзіннік прабіў тры гадзіны, заглыбляйся ўся ў Маю міласэрнасць, ушаноўваючы і праслаўляючы яе; заклікай яе ўсемагутнасць для цэлага свету, і асабліва для бедных грэшнікаў, бо ў гэту хвіліну яна адкрылася насцеж для кожнай душы. У гэту гадзіну ты выпрасіш усё і для сябе, і для іншых; у гэту гадзіну з’явілася ласка для ўсяго свету — міласэрнасць перамагла правасуддзе.

Дачка Мая, старайся ў гэту гадзіну разважаць над стацыямі Крыжовага шляху, наколькі табе дазволяць твае абавязкі; а калі не можаш трываць на Крыжовым шляху, то, прынамсі, зайдзі хоць на хвіліну ў капліцу і ўшануй Маё Сэрца, поўнае міласэрнасці ў Найсвяцейшым Сакрамэнце; а калі не можаш зайсці ў капліцу, пагрузіся ў малітву там, дзе ты знаходзішся, хоць на кароткі момант. Я патрабую пашаны да Маёй міласэрнасці ад кожнага стварэння, але найперш ад цябе, бо Я даў табе найглыбей спасцігнуць гэтую таямніцу.

## Вяночак да Божай Міласэрнасці

*Вяночак да Божай Міласэрнасці Пан Езус прадыктаваў святой Фаўстыне ў Вільні 13–14 верасня 1935 года як малітву для суцішвання Божага гневу і перапрашэння за грахі нашыя і ўсяго свету.*

«Праз гэты Вяночак ты выпрасіш усё, калі тое, аб чым просіш, будзе згоднае з Маёю воляю» (пар. «Дзённік», 1731).

«Калі пры паміраючым моляцца гэты Вяночак, уціхамірваецца гнеў Божы, неспасцігальная міласэрнасць атуляе душу» (пар. «Дзённік», 811).

*Молімся на звычайным ружанцы.*

Напачатку:

*Ойча наш... Вітай, Марыя... Веру ў Бога...*

На вялікіх пацерках:

Ойча Спрадвечны, ахвярую Табе Цела і Кроў, Душу і Боскасць наймілейшага Сына Твайго і Пана нашага, Езуса Хрыста, каб перапрасіць за грахі нашыя і ўсяго свету.

На малых пацерках:

Дзеля Яго балеснай мукі будзь міласэрны да нас і да ўсяго свету.

На заканчэнне:

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, – змілуйся над намі і над усім светам! *(3 разы)*

О Кроў і Вада, якая выплыла з Найсвяцейшага Сэрца Езуса як крыніца Міласэрнасці для нас, давяраю Табе! *(3 разы)*

Езу, давяраю Табе. *(3 разы)*

## Літанія да Божай Міласэрнасці

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон.*
Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*
Ойча з неба, Божа, *– змілуйся над намі.*
Сыне, Адкупіцель свету, Божа,
Духу Святы, Божа,
Святая Тройца, адзіны Божа, *– змілуйся над намі.*

Міласэрнасць Божая, бязмежная годнасць Стварыцеля,
*– давяраем Табе.*
Міласэрнасць Божая, найбольшая дасканаласць Адкупіцеля,
Міласэрнасць Божая, неспасцігальная любоў Асвяціцеля,
Міласэрнасць Божая, незразуметая таямніца Святой Тройцы,
Міласэрнасць Божая, праяўленне найвялікшай моцы Пана,
Міласэрнасць Божая ў стварэнні духаў нябесных,
Міласэрнасць Божая, якая кліча нас з небыцця да існавання,
Міласэрнасць Божая, якая ахоплівае ўвесь сусвет,
Міласэрнасць Божая, якая адорвае нас несмяротным жыццём,
Міласэрнасць Божая, якая ахоўвае нас ад заслужанага пакарання,
Міласэрнасць Божая, якая ўздымае нас з няшчасця граху,
Міласэрнасць Божая, якая апраўдвае нас у Слове ўцелаўлёным,
Міласэрнасць Божая, якая струменіць з ранаў Хрыстовых,
Міласэрнасць Божая, якая сыходзіць з Сэрца Езуса,
Міласэрнасць Божая, якая дае нам Найсвяцейшую Панну Марыю
за Маці міласэрнасці,
Міласэрнасць Божая ў аб’яўленні таямніцаў Божых,
Міласэрнасць Божая ва ўстанаўленні паўсюднага Касцёла,
Міласэрнасць Божая ва ўстанаўленні святых сакрамэнтаў,
Міласэрнасць Божая ў сакрамэнце хросту і пакаяння,
Міласэрнасць Божая ў сакрамэнце алтара і святарства,
Міласэрнасць Божая ў пакліканні нас да святой веры,
Міласэрнасць Божая ў навяртанні грэшнікаў,

Міласэрнасць Божая ў асвячэнні справядлівых,
Міласэрнасць Божая ва ўдасканаленні праведнікаў,
Міласэрнасць Божая, палёгка для хворых і церпячых,
Міласэрнасць Божая, суцяшэнне змучаных сэрцаў,
Міласэрнасць Божая, надзея для тых, хто ў роспачы,
Міласэрнасць Божая, якая спадарожнічае ўсім людзям
заўсёды і ўсюды,
Міласэрнасць Божая, што апярэджвае нас ласкамі,
Міласэрнасць Божая, супакой паміраючых,
Міласэрнасць Божая, нябесная раскоша збаўленых,
Міласэрнасць Божая, прахалода і палёгка душаў чыстцовых,
Міласэрнасць Божая, карона ўсіх святых,
Міласэрнасць Божая, невычэрпная крыніца цудаў, – *давяраем Табе*.

Баранку Божы, які праявіў найбольшую міласэрнасць у адкупленні свету на крыжы, – *даруй нам, Пане*.

Баранку Божы, які міласэрна ахвяруеш сябе за нас падчас кожнай святой Імшы, – *выслухай нас, Пане*.

Баранку Божы, які з бясконцай міласэрнасці адпускаеш грахі нашыя, – *змілуйся над намі.*

С.: Міласэрнасць Божая па-над усе Яго справы (гл. Пс 145, 9).

Н.: Таму Міласэрнасць Пана праслаўляць буду навекі (гл. Пс 89, 2).

*Молімся:* Божа, міласэрнасць Твая бязмежная, а скарбы літасці бясконцыя. Глянь на нас ласкава і ўмацуй нашу надзею на міласэрнасць Тваю, каб мы ніколі, нават у самых цяжкіх выпрабаваннях, не паддаваліся роспачы, але заўсёды з даверам згаджаліся з Тваёю воляю, бо Ты – сама Міласэрнасць. Праз Пана нашага Езуса Хрыста, Валадара міласэрнасці, які з Табою і Духам Святым аказвае нам міласэрнасць навекі.

Н.: Амэн.

## Дадатак

*Святая Фаўстына вучыць нас, што цярпенне, прынятае з верай, набліжае нас да Бога і вядзе да еднасці з Ім. Яна цярпліва тлумачыць нам, што надзеяй для свету з'яўляецца Евангелле, таму што Добрая Навіна асвятляе цемру цярпення звышнатуральным святлом, поўным цяпла і спакою, вартым даверу, які паходзіць ад Бога.*

**Дз 823:** Сённяшні дзень я ахвяравала за святароў; у гэты дзень я цярпела больш, чым калі-небудзь, — і ўнутрана, і знешне. Я не ведала, што за адзін дзень можна гэтулькі выцерпець. Я старалася адправіць Святую гадзіну, у часе якой мой дух скаштаваў гетсэманскай горычы; я змагаюся адна, падтрыманая Яго плячом, супраць усялякіх цяжкасцяў, якія, быццам непераадольныя муры, паўстаюць перада мною, але я давяраю сіле Яго Імені і нічога не баюся.

**Дз 699:** Аднаго разу я пачула такія словы: Дачка Мая, кажы ўсяму свету пра Маю неспасцігальную міласэрнасць. Я прагну, каб свята Міласэрнасці было паратункам і прытулкам для ўсіх душаў, і асабліва для бедных грэшнікаў. У гэты дзень адкрытыя глыбіні Маёй міласэрнасці, Я выліваю цэлае мора ласкаў на душы, якія набліжаюцца да крыніцы Маёй міласэрнасці. Тая душа, якая прыступіць да споведзі і святой Камуніі, атрымае поўнае адпушчэнне правінаў і караў. У гэты дзень адкрытыя ўсе Божыя каналы, па якіх сыходзяць ласкі; няхай не баіцца наблізіцца да Мяне ніводная душа, нават калі б яе грахі былі, як пурпур. Мая міласэрнасць такая вялікая, што на працягу ўсёй вечнасці не спасцігне яе ніякі розум — ані чалавечы, ані анёльскі. Усё, што існуе, выйшла знутры Маёй міласэрнасці. Кожная душа ў адносінах да Мяне будзе цэлую вечнасць разважаць над Маёю любоўю і міласэрнасцю.

Свята Міласэрнасці выйшла знутры Мяне, Я жадаю, каб яно ўрачыста адзначалася ў першую нядзелю па Вялікадні. Не зведае чалавецтва спакою, пакуль не звернецца да крыніцы Маёй міласэрнасці.

**Дз 301:** Радуецца Маё Сэрца гэтаму тытулу міласэрнасці. Скажы, што міласэрнасць — найвялікшая ўласцівасць Бога. Усе справы Маіх рук укаранаваныя міласэрнасцю.

**Дз 299:** Калі аднойчы спаведнік загадаў мне спытаць у Пана Езуса, што азначаюць два прамяні на гэтым абразе, я адказала: «Добра, я спытаю ў Пана». У часе малітвы я пачула ў душы такія словы: Гэтыя два прамяні азначаюць кроў і ваду — бледны прамень азначае ваду, якая апраўдвае душы; чырвоны прамень азначае кроў, якая з’яўляецца жыццём душаў...

Гэтыя два прамяні выйшлі з глыбіні Маёй Міласэрнасці ў той момант, калі Маё канаючае Сэрца было прабіта дзідаю на крыжы. Гэтыя прамяні засланяюць душы ад гневу Айца Майго. Шчаслівы той, хто будзе жыць пад іх заслонаю, бо яго не дасягне справядлівая рука Бога.

**Дз 740:** О Збаўца свету, я яднаюся з Тваёю міласэрнасцю. Езу мой, я яднаю ўсе мае цярпенні з Тваімі і складаю ў скарбніцу Касцёла для карысці душаў.

**Дз 1777:** Пан сказаў мне: Дачка Мая, ведай, што Маё Сэрца — гэта сама міласэрнасць. З гэтага мора міласэрнасці ласкі разліваюцца на ўвесь свет. Ніводная душа, якая наблізілася да Мяне, не адышла без суцяшэння. Усялякая мізэрнасць патанае ў Маёй міласэрнасці, і ўсялякая ласка струменіць з гэтай крыніцы: збаўчая і асвячальная. Дачка Мая, Я прагну, каб тваё сэрца было святліцаю Маёй міласэрнасці. Я прагну, каб гэтая міласэрнасць разлілася праз тваё сэрца на ўвесь свет. Хто б ні наблізіўся да цябе, няхай ён не адыдзе без даверу да Маёй міласэрнасці, якой я так моцна прагну для душаў.

Маліся, колькі можаш, за канаючых, выпрошвай для іх давер да Маёй міласэрнасці, бо ім найбольш патрэбны давер, а яны яго найменш маюць. Ведай, што ласка вечнага збаўлення некаторых душаў у апошнюю хвіліну залежыць ад тваёй малітвы. Ты ведаеш усю бездань Маёй міласэрнасці, таму чэрпай з яе для сябе, і асабліва для бедных грэшнікаў. Хутчэй неба і зямля ператворацца ў нішто, чым даверлівую душу не атуліць Мая міласэрнасць.

**Дз 1738:** Пан сказаў мне: Часта ўваходзь у чысцец, бо там ты патрэбна. О мой Езу, я разумею значэнне Тваіх словаў, скіраваных да мяне, але дазволь мне спачатку ўвайсці ў скарбніцу Тваёй міласэрнасці.

**Дз 742:** Я патрабую ад цябе ўчынкаў міласэрнасці, якія павінны сыходзіць з любові да Мяне. Ты павінна заўсёды і ўсюды праяўляць міласэрнасць да бліжніх, ты не можаш ад гэтага ані ўхіліцца, ані адмовіцца, ані адрачыся. Я даю табе тры спосабы ажыццяўлення міласэрнасці ў адносінах да бліжніх: першы — учынак, другі — слова, трэці — малітва; у гэтых трох ступенях заключаецца ўся паўната міласэрнасці, якая з'яўляецца неаспрэчным доказам любові да Мяне. Такім чынам душа праслаўляе Маю міласэрнасць і ўшаноўвае. Так, першая нядзеля па Вялікадні — гэта свята Міласэрнасці, але павінна быць і дзеянне, Я патрабую ўшанавання Маёй міласэрнасці праз урачыстае адзначэнне гэтага свята і праз ушанаванне намаляванага абраза. Праз гэты абраз Я ўдзялю шмат ласкаў душам, ён павінен нагадваць аб патрабаваннях Маёй міласэрнасці, бо нават самая моцная вера нічым не дапаможа без учынкаў.